*Настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА “Гімназія г.Быхава” Дзяменцій Л.В.*

**Шаноўныя старшакласнікі!**

Штогод на ЦТ прапануецца заданне, у якім неабходна правільна ўжыць **часціцы не, ні** (2019 год - **заданне А 15**). Для таго, каб **паспяхова справіцца** з ім, раю наступнае:

**1.** паўтарыце тэарэтычны матэрыял па падручніках, якія можна скампаваць па ссылцы: https://www.aversev.by/skachat/?filter=subject-is-bel&param=uch).
- Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; **§46**;
- Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; **§ 47**.

**2.** Вывучыце табліцу-апору “Ужыванне часціц не, ні”.

**3.** Выканайце прыведзенае ніжэй практыкаванне, параўнайцеся з эталонам.

**4.** Выканайце тэставыя заданні са зборнікаў ЦТ за мінулыя гады.

# У ж ы в а н н е ч а с ц і ц НЕ, НІ

| | | |
|---|---|---|
| НЕ | Калі знаходзіцца **пры выказніку** | Служба не дружба. Шыла ў мяшку не схаваеш. |
| | Не + **магчы** + не + **інфінітыў** (састаўны дзеяслоўны выказнік) | Я **не магу не сказаць** праўды. |
| | У пытальна-клічных сказах **? (!)** | Каму не вядома імя Францыска Скарыны? Якімі толькі фарбамі не пералівалася раса! |
| | у спалучэнні **не раз** са значэннем ‘часта’, ‘многа разоў’ | Я **не раз** *(=часта)* пераконваўся, што за любую працу трэба з розумам брацца. |
| | у спалучэнні **не адзін** са значэннем ‘некалькі’, ‘шмат’ | Не адзін (=шмат дзён) дзень ішоў дождж. |
| | не што іншае, як / не хто іншы, як } =менавіта (=іменна) | Макар адчыніў дзверы хаты і зразумеў: так пахне не што іншае, як (=менавіта) пірог з журавінамі. |
| | у сказах са словамі **нельга, немагчыма** | **Нельга** было **не здзівіцца**, як павалілася дрэва ад першага подыху ветру. |
| НІ | у спалучэнні **ні разу** са значэннем ‘ніколі’ | **Ні разу** (=ніколі) не шукаў я лёгкага хлеба і смела ішоў туды, куды вёў мяне лёс. |
| | у спалучэнні **ні адзін** са значэннем ‘ніхто’ | **Ні адзін** (=ніхто) не адмовіўся прыйсці. |
| | у даданай частцы складаназалежнага сказа | (Колькі б **ні** раілі правяраць), [сябрам сваім я заўжды проста давяраю]. |
| | сказ без дзейніка, але есць **дапаўненне ў Р.скл.** | На дрэвах ужо **ні лістка** (Р.скл.). |
| | у складзе фразеалагізмаў | *ні рыба ні мяса, ні жывы ні мёртвы, ні прайсці ні праехаць, ні свет ні зара, ні канца ні краю, ні хаты ні лапаты і інш.* |
| | ніхто іншы…~~як~~…… не (выказнік) нішто іншае …~~як~~…. не (выказнік) | ***Нішто іншае*** *яго не цікавіла.* |
| | хто ні, што ні, дзе ні, куды ні, як ні (хто **б** ні) | Куды ні кінеш вокам, зачароўвае прастор і прыгажосць. |

**Практыкаванне. Спішыце сказы, на месцы пропуску ўстаўце часціцу не або ні.**

1) Пячнік нічога _ зразумеў.
2) Нібыта я яго больш ніколі не бачыў - _ з саней, _ з машыны, _ з рыплівай сцежкі.
3) _ гуку, _ шолаху.
4) Ну, а на месцы Галі пайшла б за яго _ адна.
5) - Чаму _ адчыняла?.. Бацька дзе?
6) «Вэтэрынар» дык той проста прэцца ў хату ці ў кухню сам, а Жук толькі хвастом павільвае кажнаму, хто _ выйдзе.
7) Гледзячы на цябе, я _ мог _ думаць, што такія, як ты, веселуны і рабацягі былі не толькі ў Абісініі, але і на палях маёй радзімы.
8) Вядома, _ адзін - з гармонікам.
9) _ раз хадзіў ён ноччу ў Качаны, ды без гармоніка: на нейкую ціхую справу...
10) Галі ў маленстве ніхто _ здымаў.
11) Ты - харошая, ты больш _ будзеш пытацца?
12) Рос [клёнік] _ адзін, а разам з іншымі дрэўцамі, якія ў гэтую восень былі пасаджаны абапал дарогі з гасцінца ў калгас.
13) Ды не, не шкадуе, _ разу нават, здаецца, і не падумала.
14) Што _ спытаю - нічога, не хоча казаць!..
15) Ты _ можаш _ ведаць яшчэ адну цудоўную казку тваёй Італіі, твайго адзінага на свеце Капры...
16) А ўсё ж і назаўтра, і колькі б разоў мама _ пасылала мяне ў тую жахліва-казачную хатку, я ахвотна ішоў.
17) За ўсё жыццё _ разу не пасварыліся.

*Паводле Янкі Брыля*

**АДКАЗЫ**

1) Пячнік нічога не зразумеў.
2) Нібыта я яго больш ніколі не бачыў - ні з саней, ні з машыны, ні з рыплівай сцежкі.
3) Ні гуку, ні шолаху.
4) Ну, а на месцы Галі пайшла б за яго не адна.
5) - Чаму не адчыняла?.. Бацька дзе?
6) «Вэтэрынар» дык той проста прэцца ў хату ці ў кухню сам, а Жук толькі хвастом павільвае кажнаму, хто ні выйдзе.
7) Гледзячы на цябе, я не мог не думаць, што такія, як ты, веселуны і рабацягі былі не толькі ў Абісініі, але і на палях маёй радзімы.
8) Вядома, не адзін - з гармонікам.
9) Не раз хадзіў ён ноччу ў Качаны, ды без гармоніка: на нейкую ціхую справу...
10) Галі ў маленстве ніхто не здымаў.
11) Ты - харошая, ты больш не будзеш пытацца?
12) Рос [клёнік] не адзін, а разам з іншымі дрэўцамі, якія ў гэтую восень былі пасаджаны абапал дарогі з гасцінца ў калгас.
13) Ды не, не шкадуе, ні разу нават, здаецца, і не падумала.
14) Што ні спытаю - нічога, не хоча казаць!..
15) Ты не можаш не ведаць яшчэ адну цудоўную казку тваёй Італіі, твайго адзінага на свеце Капры...
16) А ўсё ж і назаўтра, і колькі б разоў мама ні пасылала мяне ў тую жахліва-казачную хатку, я ахвотна ішоў.
17) За ўсё жыццё ні разу не пасварыліся.

*Паводле Янкі Брыля*